ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ
ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ,
КУЛЬТУРЫ І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ**

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ
ИДЕОЛОГИЧЕСКОЙ РАБОТЫ,
КУЛЬТУРЫ И ПО ДЕЛАМ МОЛОДЁЖИ**

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

27.02.2023 № 27

г. Гомель

г. Гомель

Аб правядзенні абласнога свята
аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па
інтарэсах «Захапленні на любы густ»

З мэтай актывізацыі дзейнасці аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах для людзей сталага ўзросту, садзейнічання рэалізацыі творчага і культурнага патэнцыялу, далучэння іх да актыўнай сацыяльна-культурнай дзейнасці

ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці абласное свята аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах «Захапленні на любы густ» (далей – абласное свята) у верасні-кастрычніку 2023 года ў гарадах Буда-Кашалёва і Нароўля.

2. Зацвердзіць палажэнне, склад арганізацыйнага камітэта (дадаткі 1, 2).

3. Арганізацыю і правядзенне абласнога свята ўскласці на ўстанову «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» (Сафрановіч Н.Д.), аддзелы ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Буда-Кашалёўскага (Сцепаненка А.М.) і Нараўлянскага (Альховік М.А.) райвыканкамаў.

4. Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенню абласнога свята ажыццявіць за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021-2025 гг.

5. Начальнікам аддзелаў (упраўлення) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкамаў, Гомельскага гарвыканкама арганізацыйна забяспечыць удзел аматарскіх аб'яднанняў у абласным свяце.

6. Кантроль за выкананнем дадзенага загада ўскласці на першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Заўгародняю І.С.

Начальнік галоўнага ўпраўлення Д.У.Езерскі

ГУ 0009406

Зак. 6555–3000.

Дадатак 1
да загада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад 27.02. 2023 г. № 27

**Палажэнне**
аб правядзенні абласнога свята аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах «Захапленні на любы густ»

1. **Мэты абласнога свята.**

Абласное свята аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах «Захапленні на любы густ» (далей − абласное свята) праводзіцца ў мэтах:

актывізацыі дзейнасці аматарскіх аб'яднанняў, клубаў па інтарэсах, калектываў аматарскай творчасці;

садзейнічання рэалізацыі творчага і культурнага патэнцыялу людзей сталага ўзросту, далучэння іх у актыўную сацыяльна-культурную дзейнасць;

устанаўлення і падтрымцы творчых сувязяў паміж удзельнікамі аматарскіх аб'яднанняў, прапагандзе вопыта работы аматарскіх аб'яднанняў вобласці.

2. **Кіраўніцтва абласным святам.**

Для падрыхтоўкі і правядзення абласнога свята ствараецца абласны арганізацыйны камітэт, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, установы «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці», аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Буда-Кашалёўскага і Нараўлянскага райвыканкамаў.

У перыяд падрыхтоўкі абласнога свята аргкамітэт далучае сродкі масавай інфармацыі да асвятлення ходу абласнога свята, дапамагае ў яго правядзенні, ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва абласным святам у тэрмін правядзення мерапрыемства.

3. **Умовы і парадак правядзення абласнога свята.**

Абласное свята адбудзецца ў верасні 2023 года ў гарадах Буда-Кашалёва і Нароўля.

У абласным свяце прымаюць удзел калектывы аматарскай творчасці з найменнем «народны»; аматарскія аб'яднанні і клубы па інтарэсах клубных устаноў Гомельскай вобласці.

Абласное свята праводзіцца ў тры этапы.

**І этап** – аддзелы (упраўленне) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкамаў, Гомельскага гарвыканкама вызначаюць адно фарміраванне для сталых людзей (ад 58 год і вышэй) клубных устаноў культуры ад раёна (горада) і прадстаўляюць **да 15 жніўня 2023 года** на электронную пошту ltikdd@ocntgomel.by ва ўстанову «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці», аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці:

заяўку на ўдзел у абласным свяце (форма дадаецца);

партфоліа на дзейнасць клуба (форма дадаецца).

**ІІ этап** – прагляд конкурсных праграм. Заяўленыя аматарскія калектывы, аб'яднанні прымаюць удзел ва ўсіх 3-х намінацыях:

1. «Знаёмцеся, гэта – МЫ!» - візітная картка калектыву (канцэртная праграма, абрадавае дзейства, тэатралізаваная дзея ці іншыя), працягласць выступлення – да 15 хвілін;

2. «Добрых рук майстэрства» – выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, працягласць прэзентацыі – да 3 хвілін;

3. «Палеская смаката» – выстава традыцыйнай стравы свайго раёна, (колькасць блюдаў не абмежавана), працягласць прэзентацыі – да 5 хвілін.

Прагляд праводзіцца па двум зонам у **верасні** 2023 года.

1 зона – г. Буда-Кашалёва:

Акцябрскі раён;
Буда-Кашалёўскі раён;
Веткаўскі раён;
Гомельскі раён;
Добрушскі раён;
Жлобінскі раён;
Кармянскі раён;
Рэчыцкі раён;
Рагачоўскі раён;
Светлагорскі раён;
Чачэрскі раён;
г. Гомель.

2 зона – г. Нароўля:

Брагінскі раён;
Ельскі раён;
Жыткавіцкі раён;
Калінкавіцкі раён;
Лельчыцкі раён;
Лоеўскі раён;
Мазырскі раён;

Нараўлянскі раён;
Петрыкаўскі раён;
Хойніцкі раён.

**III этап** – падвядзенне вынікаў абласнога свята і ўзнагароджванне.

Журы будзе ўлічваць:

пазітыўную накіраванасць выступлення ўдзельнікаў;

выканаўчы ўзровень, відовішчнасць, артыстызм;

мастацкі ўзровень вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

узровень афармлення выстаў і іх прэзентацыю.

Па выніках конкурсных творчых праграм, прэзентацый выстаў журы вызначае пераможцаў у 2 катэгорыях:

калектывы аматарскай творчасці з найменнем «народны»;

аматарскія аб'яднанні і клубы па інтарэсах і у кожнай з 3 намінацый з уручэннем дыпломаў і падарункаў:

дыплом I ступені і падарунак на суму ў памеры да 7 базавых велічынь;

дыплом II ступені і падарунак на суму ў памеры да 6 базавых велічынь;

дыплом III ступені і падарунак на суму ў памеры да 5 базавых велічынь.

Прадугледжваецца ўзнагароджванне дыпломамі і падарункамі на суму ў памеры да двух базавых велічынь (кожная) у дадатковых намінацыях:

«крэатыўнасць ідэі»;

«захаванне нацыянальных традыцый»;

«творчы падыход»;

«яскравае ўвасабленне вобраза».

Калектывы, не стаўшыя пераможцамі, узнагароджваюцца граматамі за ўдзел.

Вызначэнне пераможцаў абласнога свята да 10 кастрычніка 2023 года.

Пры неабходнасці журы мае права прысудзіць не ўсе дыпломы, змяніць намінацыі або ўвесці новыя. Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае. У выпадку непрысуджэння, падзелу месцаў паміж удзельнікамі дапускасцца падзел падарункаў у межах, прадугледжаных сродкамі абласнога бюджэту. Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае.

Па выніках абласнога свята выдаецца буклет.

**5. Фінансаванне.**

Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенню абласнога свята ажыццявіць за кошт абласнога бюджэту, прадугледжаных установе «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021-2025 гг.

**6. Камандзіровачныя і транспартныя выдаткі.**

Камандзіровачныя і транспартныя выдаткі ўдзельнікаў абласнога свята ажыццяўляюцца за кошт накіроваючага боку.

**7. Кантакты.**

Адрас: 246022, г. Гомель, вул. Кірава, 49, установа «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці».

e-mail: ltikdd@ocntgomel.by

Кантактны нумар: (0232) 33-73-02, аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці, Хахракова Таццяна Уладзіміраўна.

Дадатак 2
да загада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад 27.02. 2023 г. № 27

**Склад арганізацыйнага камітэта**
абласнога свята аматарскіх аб'яднанняў
і клубаў па інтарэсах «Захапленні на любы густ»

| | |
|---|---|
| Заўгародняя<br>Інга Сяргееўна | першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта |
| Сафрановіч<br>Наталья Дзмітрыеўна | дырэктар установы «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» |
| Сцепаненка<br>Алена Міхайлаўна | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Буда-Кашалёўскага райвыканкама |
| Альховік<br>Марына Аляксееўна | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Нараўлянскага райвыканкама |

**Заяўка**
на ўдзел у абласным свяце аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах «Захапленні на любы густ»

Раён (горад)______________________________________

| | |
|---|---|
| Назва аматарскага аб'яднання | |
| Прозвішча , імя, імя па бацьку кіраўніка аб'яднання, кантактны нумар | |
| Базавая прыналежнасць | |
| Колькасць удзельнікаў | |
| Назва візітнай карткі-прэзентацыі | |
| Працягласць прэзентацыі | |
| Назва стравы (кулінарнага блюда) | |
| Пералік выставы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва | |
| Неабходнае абсталяванне | |

Подпіс кіраўніка ўстановы _______________

П.І.І па бацьку

Партфоліа
калектыва аматарскай творчасці, аматарскага аб'яднання, клуба па інтарэсах для ўдзелу ў абласным свяце аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах «Захапленні на любы густ»

Раён (горад)________________________________________

| | |
|---|---|
| Пашпарт аматарскага аб'яднання, калектыву аматарскай творчасці | |
| Творчая характарыстыка аб дзсйнасці калектыву (электронны дакумент, у фармаце .doc , .docx ) | |
| 2-3 фатаграфіі калектыву | |

Подпіс кіраўніка ўстановы __________ П.І.І па бацьку

# СОГЛАСИЕ

на обработку персональных данных руководителя, участника областного праздника любительских объединений и клубов по интересам «Увлечения на любой вкус»

Я, ________________________________________________________________,

(фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется)

__.__.____ (дата и год рождения), подтверждаю согласие на участие в областном празднике любительских объединений и клубов по интересам «Увлечения на любой вкус» (далее – областной праздник).

В соответствии с Законом Республики Беларусь от 7 мая 2021 г. № 99 З «О защите персональных данных» даю согласие Учреждению «Гомельский областной центр народного творчества», г. Гомель, ул. Кирова, 49, на сбор, систематизацию, хранение, изменение, использование, обезличивание, блокирование, распространение, предоставление, удаление следующих персональных данных в рамках организации и проведения конкурсных мероприятий:

- фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется);
- дата и год рождения;
- мобильный телефон.

Обработка моих персональных данных может осуществляться как автоматизированным, так и неавтоматизированным способом.

Согласие на обработку моих персональных данных даю в целях:

- регистрации в базе данных участников конкурсных мероприятий путем записи персональных данных участника;
- дальнейшей передачи персональных данных в государственные органы с целью совершения действий в соответствии Законами Республики Беларусь;
- передачи персональных данных третьим лицам (организациям), которые в соответствии с договором с организатором областного праздника осуществляют организационные мероприятия;
- в рамках организации и проведения указанных мероприятий распространения персональных данных (фото, Ф.И.О., общественная деятельность) путем размещения в Интернете, буклетах и периодических образовательных изданиях с возможностью редакторской обработки, а также в целях подготовки раздаточных материалов, листов регистрации, листов оценки работ экспертов, итоговых бюллетеней и каталогов.

Согласие предоставлено на срок: до дня отзыва в письменной форме либо до достижения целей обработки персональных данных.

Подтверждаю, что до подписания данного согласия мне простым и ясным языком разъяснена информация о моих правах, связанных с обработкой персональных данных, о механизме реализации таких прав, последствиях дачи согласия или отказа в даче такого согласия, а также порядок отзыва согласия: в любое время, подав оператору персональных данных письменное заявление.

__ __.____.________ ____________ ______________________________

(дата) (подпись) (инициалы, фамилия субъекта персональных данных)